23–24 чэрвеня 2016 года на філалагічным факультэце адбылася XXV Міжнародная навуковая канферэнцыя “**Беларуска-польскія моўныя, літаратурныя, гістарычныя і культурныя сувязі**”. Суарганізатарамі канферэнцыі выступілі філалагічны факультэт БДУ, рэспубліканскае аддзяленне ГА “Міжнародная асацыяцыя беларусістаў” і Польскі Інстытут у Мінску. З прывітальнымі словамі да ўдзельнікаў канферэнцыі звярнуліся дэкан філалагічнага факультэта І.С.Роўда, прарэктар па вучэбнай рабоце А.В.Данільчанка, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Польшча ў Рэспубліцы Беларусь Конрад Паўлік, старшыня ГА “Міжнародная асацыяцыя беларусістаў” А.Суша і старшыні рэспубліканскага і польскага аддзяленняў гэтай арганізацыі І.Багдановіч і М.Саевіч.

Традыцыйнае навуковае мерапрыемства сабрала гэтым разам 20 польскіх і 25 беларускіх удзельнікаў, сярод якіх былі як тыя, хто даўно займаецца даследаваннем беларуска-польскіх сувязей у галіне мовы, літаратуры, гісторыі і культуры, так і пачаткоўцы ў гэтых напрамках.

Падчас канферэнцыі адбылося ўрачыстае ўганараванне 85-гадовага юбілею вядомага вучонага-беларусіста, першага амбасадара Рэспублікі Польшчы ў Рэспубліцы Беларусь пані прафесара **Эльжбеты Смулковай**.

У хуткім часе плануецца выхад з друку зборніка матэрыялаў канферэнцыі.

23–24 июня 2016 года на филологическом факультете состоялась XXV Международная научная конференция “белорусско-польские языковые, литературные, исторические и культурные связи”. Соорганизаторами конференции выступили филологический факультет БГУ, республиканское отделение ОО “Международная ассоциация белорусистов” и Польский Институт в Минске. С приветственными словами к участникам конференции обратились декан филологического факультета И.С.Ровдо, проректор по учебной работе А.В.Данильченко, Чрезвычайный и Полномочный Посол Республики Польши в Республике Беларусь Конрад Павлик, председатель ОО “Международная ассоциация белорусистов” А.Суша и председатели республиканского и польского отделений этой организации И.Богданович и М.Саевич.

Традиционное научное мероприятие собрало на этот раз 20 польских и 25 белорусских участников, среди которых были как те, кто давно занимается изучением белорусско-польских языковых, литературных и историко-культурологических связей, так и начинающие в этой сфере исследователи.

Во время конференции был торжественно отмечен 85-летний юбилей известного ученого-белорусиста, первого посла Республики Польши в Республике Беларусь профессора Эльжбеты Смулковай.

В скором времени планируется выход сборника материалов конференции.